УДК 930.(476)

**_А.А. Савіч_**
*канд. гіст. навук, дац., дац. каф. гісторыі славянскіх народаў*
*Брэсцкага дзржаўнага ўніверсітэта імені А.С. Пушкіна*

# СЯЛЯНСКІ РУХ У ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ Ў 1921–1939 гг. У АЙЧЫННАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ СЯРЭДЗІНЫ 1950-х – 1980-х гг.

*У даследаванні прадстаўлены асноўныя навукова-метадалагічныя падыходы да вывучэння і адлюстравання гісторыі сялянскага руху ў Заходняй Беларусі 1921–1939 гг. беларускімі гісторыкамі 1950-х – 1980-х гг. Дэманструючы пашырэнне і паглыбленне даследуемай праблематыкі ў параўнанні з папярэднім перыядам, вучоныя не маглі выйсці за рамкі абумоўленай марксісцка-ленінскімі падыходамі і пануючай ідэалогіяй схемы. Вызначальнымі рысамі такой канцэпцыі было перабольшванне актыўнасці, палітызаванасці і рэвалюцыйнасці сялянскага руху, абумоўленасць развіцця сялянскай барацьбы станам рабочага руху і арганізацыйнымі магчымасцямі Кампартыі Заходняй Беларусі (КПЗБ), ігнараванне ролі палітычных канкурэнтаў кампарыі ў арганізацыі і правядзенні сялянска-аграрных мерапрыемстваў. На падставе разнастайных крыніц, у першую чаргу архіўных матэрыялаў, зроблена выснова аб неабгрунтаванасці, заідэалагізаванасці і тэндэнцыйнасці прыведзеных тэзісаў, падаецца карэкціроўка і ўдакладненне адпаведных пазіцый.*

## Уводзіны

У другой палове 1950-х гг. пасля рэабілітацыі КПЗБ у час працы XX з’езда КПСС у БССР пачалася актывізацыя даследавання гісторыі Заходняй Беларусі. Асноўныя падыходы да вывучэння заходнебеларускай праблематыкі былі распрацаваны партыйна-дзяржаўнымі ідэалагічнымі органамі і выкладзены на старонках партыйных выданняў [30, с. 46–47]. У гэты час набывае актуальнасць і гісторыя сялянскага руху, бо аграрнае пытанне ў Заходняй Беларусі было галоўным: абсалютная большасць насельніцтва пражывала ў сельскай мясцовасці і займалася сельскай гаспадаркай [29, с. 238]. Прыведзеная дэмаграфічная асаблівасць вымагала ад даследчыкаў звароту да праблем сельскагаспадарчай сферы, акцэнтуючы асаблівую ўвагу на складанасцях аб’ектыўна-гістарычнага характару і звязаных з наступствам ажыццяўлення аграрнай палітыкі ўрадам Польшчы, падаючы іх як ланцуг прычын-перадумоў сялянскага руху. Аднак разам з гэтым колькасць навукоўцаў, якія паглыблена і мэтанакіравана ажыццяўлялі даследаванне пытанняў змагання сялян, фактычна абмяжоўваецца І.В. Палуянам, У.А. Палуянам і А.А. Сарокіным, а таксама суаўтарамі калектыўнай манаграфіі «Революционный путь Компартии Западной Белоруссии». Гэта тлумачыцца відавочнай дыспрапорцыяй у заходнебеларускай савецкай гістарыяграфіі, якая характарызавалася пануючым становішчам гісторыка-партыйнай тэматыкі – гісторыі КПЗБ як партыі рабочага класу.

## Асноўныя контуры гісторыі сялянскага руху Заходняй Беларусі ў даследаваннях айчынных гісторыкаў

Аграрна-сялянская праблематыка выкарыстоўвалася ў адлюстраванні гісторыі КПЗБ на розных этапах яе існавання і ў сувязі з ажыццяўленнем партыяй сваёй гістарыяграфічна афармленай «шматграннай дзейнасці», таму асобныя аспекты праяваў сялянскага руху, паказаныя на старонках выданняў гэтага перыяду, садзейнічалі падмацаванню сцвярджэнняў аб авангарднай і кіруючай ролі КПЗБ, рэвалюцыйнасці заходнебеларускага сялянства ў адказ на прыгнёт, у тым ліку і ў партызанскім руху, гістарыяграфічныя аспекты якога патрабуюць асобнага прадметнага даследавання [30, с. 146–154]. Адпаведныя канцэптуальныя падыходы панавалі ў гістарыяграфіі да пачатку 1990-х гг., вызначаючы змест навуковых даследаванняў, былі шматразова прадэманстраваны пры даследаванні сялянскага руху як часткі нацыянальна-вызваленчай барацьбы ў адпаведнасці з перыядызацыяй, канчаткова сфармуляванай У.А. Палуянам і І.В. Палуянам, якія

выдзелілі чатыры перыяды ў развіцці рэвалюцыйнага і нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі [27, с. 7–8].

Так, А.У. Царук адносна пачатку 1920-х гг. лічыў, што выступленні рабочага класа Заходняй Беларусі былі штуршком для разгортвання рэвалюцыйнай барацьбы бяднейшага сялянства, сельскагаспадарчага пралетарыяту і парабкаў. Гісторык неабгрунтавана падводзіў да думкі аб усенародным супраціўленні польскай уладзе, абсалютызуючы класавыя падыходы, даследчык эканамічныя выступленні сялян характарызаваў у большасці як «палітычныя выступленні абяздоленага народа супраць буржуазна-памешчыцкіх эксплуататараў, за ўз’яднанне з СССР» [33, с. 132]. Відавочнай зададзенасцю і схематызмам у адлюстраванні барацьбы сялян Заходняй Беларусі выдзяляецца праца Б.Я. Кухарава, адной з мэт якога быў паказ ролі КПЗБ у «рэвалюцыйнай барацьбе працоўных супраць каланіяльнага падпарадкавання буржуазна-памешчыцкай Польшчай» [12, с. 5]. Дэманструючы КПЗБ-цэнтрызм, гісторыкі як негатыўную асаблівасць сацыяльна-палітычнага становішча ў вёсцы называлі актыўную прысутнасць іншых палітычных партый, якія прываблівалі сялян сваімі праграмнымі пастулатамі. І.В. Палуян і У.А. Палуян адзначылі, што з прычыны адсутнасці КПЗБ значная частка насельніцтва ў 1921–1923 гг. аказалася пад уплывам дробнабуржуазных арганізацый і груповак (беларускія эсэры, ППС, «Вызваленне» і інш.). Пры гэтым даследчыкі нават самыя звычайныя формы сялянскага свавольства (патравы памешчыцкіх пасеваў, самавольныя высечкі лесу, выпас жывёлы на памешчыцкіх лугах, падпальванне памешчыцкіх маёнткаў) абумоўлівалі уплывам камуністычнай агітацыі [27, с. 69–71]. Аднак гаварыць пра выключны аўтарытэт камуністаў сярод сялянства ў гэты час не прыходзіцца: паводле архіўных дакументаў у выглядзе справаздач кіраўнікоў КПЗБ, нават у сярэдзіне 1920-х гг. цэлыя раёны і акругі «партыі рабочага класу» спынялі сваю дзейнасць. Напрыклад, Жабінкаўскі раён, «дзякуючы сабатажу адказнага сакратара раёна амаль зусім распаўся. Распаду садзейнічаў ліст аднаго таварыша, былога функцыянера акруговага камітэта, які напісаў з турмы да іх (членаў КПЗБ. – *А.С.*), каб не працавалі, былі больш асцярожнымі, таму што гарадскі пралетарыят нічога не робіць, а таму і ім не трэба рабіць» [16, арк. 13]. Так што частыя згадкі ў публікацыях пра наяўнасць і трываласць саюза рабочага класа і сялянства з’яўляюцца кан’юнктурнай нацяжкай.

Тэзіс аб вызначальным уплыве рабочых выступленняў на сялянскі рух і адначасова яго стыхійнасці да стварэння КПЗБ знаходзіў сваё далейшае пацвярджэнне пафаснымі разважаннямі аб «баявых выступленнях» рабочага класа ў гарадах, якія аказвалі рэвалюцыянізуючае ўздзеянне на сялян. Адзначаны дэтэрмінізм, паводле аўтараў калектыўнай манаграфіі па гісторыі КПЗБ, атрымліваў больш выразныя праявы пасля стварэння партыі, калі сялянскі рух пачаў набываць новыя формы барацьбы, у прыватнасці, КПЗБ у сярэдзіне 1924 г. заклікала да байкоту польскіх школ і падаткаў, адзначаючы цяжкасці, з якімі сутыкалася партыя [28, с. 60, 88–89]. У даследаваннях замоўчваўся вызначальны ўнёсак беларускіх арганізацый, палітыкаў, дзеячаў асветы і культуры, якія неслі асноўны цяжар правядзення легальнай працы ў барацьбе за беларускія школы, абароны ад свавольства мясцовай польскай адміністрацыі [1, с. 37–64]. У 1924–1925 гг. КПЗБ не мела арганізацыйных магчымасцей аказваць уплыў на школьную справу, камуністы толькі «намацвалі» слабыя месцы ў сацыяльна-культурнай і асветніцкай палітыцы ўладаў, выкарыстоўваючы актыўнасць сялян у падачы школьных дэкларацый. Тое самае тычыцца і сервітутаў, вакол якіх разгортвалася барацьба, што выкарыстоўвалі камуністы [21, арк. 13].

Аўтары, якія закранылі пытанні сялянскага руху 1925–1927 гг., адзінадушна і небеспадстаўна адзначалі, што ў часы дзейнасці Грамады сялянскі рух узмацніўся і актывізаваўся. Пры гэтым даследчыкі перабольшвалі сацыяльна-класавыя памкненні грамадоўцаў, нівеліравалі праявы нацыянальна-дэмакратычнага і этнакультурнага характа-

ру. Уступленне шырокіх мас працоўнага сялянства ў Грамаду суправаджалася ўзмацненнем класавай барацьбы ў вёсцы, як адзначылі, напрыклад, І.В. Палуян і У.А. Палуян [25, с. 123–125; 27, с. 98]. Нягледзячы на відавочнае дамінаванне ў нацыянальна-вызваленчым руху БСРГ, а ў ёй – беларускіх сялян, даследчыкі не адмаўляліся ад укаранёнага тэзіса аб авангардзе і гегемоне рэвалюцыйнага руху КПЗБ і рабочым класе. Аўтары неабгрунтавана пашыралі праявы камуністычнага ўплыву ў вёсцы, сяляне як быццам бы пад уплывам агітацыі кампартыі і Грамады перасталі купляць зямлю нават па больш прывабнай цане, што, безумоўна, не адпавядала тагачаснай рэчаіснасці. Нават актывісты кампартыі не адмаўляліся ад выгод польскай улады, адыходзілі ад удзелу ў апазіцыйнай дзейнасці, сяляне: «Элементы не вытрыманыя, няўстойлівыя, шукаюць шляхі, як бы ўладкавацца ў рамках існуючай дзяржавы. На гэтай глебе ў адной з вёсак Баранавіцкай акругі, не атрымаўшы ніякай дапамогі ад урада за іх “бальшавізм”, вырашылі крыху “супакоіцца”» [21, арк. 12, 14, 17].

Трэба прызнаць справядлівасць выказванняў У.А. Палуяна пра павелічэнне колькасці выступленняў сялян пад уплывам агітацыі БСРГ у канцы 1926 – пачатку 1927 гг., аб чым неаднойчы афіцыйна паведамлялі польскія ўлады. У.А. Палуян бачыў у гэтым наспяванне рэвалюцыйнай сітуацыі [25, с. 179]; ва ўнісон яму А.А. Сарокін, у прыватнасці, гаварыў пра ўзмацненне байкатысцкіх і нават паўстанцкіх настрояў сярод сялян [31, с. 123]. Але разважанні пра рэвалюцыйную сітуацыю з’яўляюцца перабольшваннем, і гаварыць пра ўсенародны характар апазіцыйных праяваў сялянства Заходняй Беларусі не даводзіцца. У дакументах за 1926 г. прыводзяцца звесткі пра пасіўнасць мясцовага жыхарства, сцвярджаецца, што беларусы «не праявілі сябе ў грамадска-палітычным жыцці... Настрой да дзіва берны і не выяўляе відавочных ці законспіраваных выступленняў» [6, арк. 32, 57, 87]. Рашучы палітычны настрой, які дэманстравалі сяляне, быў абумоўлены агітацыяй КПЗБ і падкантрольных ёй актывістаў БРСГ, якія, аднак, не маглі на свой бок схіліць пераважную большасць сялянства. Гэта разумела і бальшавіцкае кіраўніцтва, якое курс на ўзброенае паўстанне ў Заходняй Беларусі ў тагачасных палітычных умовах лічыла бесперспектыўным, стрымліваючы паўстанцкія настроі ў КПЗБ і Грамадзе [23].

Адносна арганізаванага сялянскага руху трэба мець на ўвазе настойлівае імкненне савецкіх гісторыкаў на фоне сцвярджаемай імі кіруючай ролі КПЗБ і Грамады замоўчваць дзейнасць іншых партый, якія дзейнічалі ў Заходняй Беларусі ў 1920–1930 гг. і мелі падтрымку сялян [11; 29, с. 334–392]. Гэта тычыцца і беларускіх арганізацый, пра актывізацыю якіх у сялянскім асяродку паведамляюць крыніцы. Матэрыялы Прадстаўніцтва ЦК КПЗБ утрымліваюць інфармацыю пра стварэнне пад кіраўніцтвам паслоў Бона, Шакуна, Шапеля, якія выйшлі з НПХ, «згодніцкай партыі» пад назвай «Радыкальная Сялянская партыя беларускіх зямель». Сцвярджаецца, што «гэтыя нікчэмныя здраднікі», да якіх аднесены таксама Ф. Ярэміч і В. Рагуля і Беларускі сялянскі саюз (БСС), Я. Станкевіч і «Беларуская сялянская партыя», БХД, «Саюз дробных землеўласнікаў» «пачынаюць развіваць узмоцненую дзейнасць сярод беларускага сялянства, намагаючыся адарваць ад саюза з пралетарыятам» [19, арк. 82]. Ёсць звесткі пра пераход былых членаў БСРГ у гурткі БСС: напрыклад, былы сакратар гуртка БСРГ у в. Малая Угрынь Дзярэчынскай гміны арганізаваў гурток БСС, у склад якога ўвайшлі дзесяць былых грамадоўцаў [5, арк. 1].

Савецкая гістарыяграфія адстойвала тэзіс аб інтэрнацыянальным адзінстве насельніцтва Заходняй Беларусі, у першую чаргу беларусаў і палякаў. Адлюстраванне гэтых сюжэтаў у найбольш завершаным выглядзе атрымала ў даследаваннях А.М. Мацко і С.У. Кабяка, якія, у прыватнасці, звярнулі ўвагу на ўзаемадзеянне КПЗБ і Незалежнай партыі хлопскай, што выдзелілася з левага крыла «Вызволення» [10, с. 46–47; 15, с. 89]. Але інтэрнацыянальныя памкненні беларусаў і палякаў («паноў», асаднікаў), нават

на прыкладзе КПЗБ і НПХ, ілюстраваць будзе вялікай нацяжкай з-за выключнай ролі Камінтэрна ў стварэнні НПХ, як і Грамады, як левaрадыкальных партый, у арганізацыі пракамуністычнага сялянска-антыўрадавага руху ў Польшчы [22, арк. 71].

Справядліва адзначаючы спад сялянскага руху і палітычнай барацьбы ў 1928–1929 гг. у параўнанні з перыядам Грамады, І.В. Палуян і У.А. Палуян акцэнтавалі ўвагу на існаванні і легальнай дзейнасці арганізацый «Змаганне» і ТБШ пад кіраўніцтвам КПЗБ [27, с. 147–149]. Але вырашальны ўдзел КПЗБ з яе раскольніцкай роляй у дачыненні да беларускага пытання, у прыватнасці, ТБШ, у сялянскім руху не пацвярджаецца крыніцамі, наадварот, яны сведчаць, што ў маі 1929 г. Сялянскае бюро ЦК КПЗБ падкрэслівала «зусім недастатковую ўвагу з боку большасці акруговых партарганізацый да пытанняў сялянскай працы, вялікую слабаць і нязначную актыўнасць большасці сялянскіх партарганізацый» [17, арк. 466].

Сусветны эканамічны крызіс нанёс адчувальны ўдар па сельскай гаспадарцы Заходняй Беларусі і садзейнічаў актывізацыі сялянскага руху, рэвалюцыйныя праявы якога І.В. Царук абумовіла «ўплывам буйных баёў пралетарыяту». Падкрэсліваючы вырашальны ўплыў на сялян КПЗБ, аўтар сцвярджала, што з 1932 г. сялянскі рух развіваўся пад лозунгамі КПЗБ, пачаў пераадольваць раз’яднанне, пераходзіць да масавых выступленняў і перарастае ў асобных выпадках ва ўзброеную барацьбу [34, с. 52–53]. Пагаджаючыся ў цэлым з гэтым, І.В. Палуян адзначыў розныя формы барацьбы сялянскіх мас, падводзячы гістарычныя падзеі пад пануючую гістарыяграфічную схему. Канцэптуальна гэта мела на ўвазе падпарадкаванне аграрных выступленняў актыўнасці КПЗБ і яе кампаніям, у прыватнасці, антыпадаткавай барацьбе пад лозунгам «Ні граша падаткаў фашысцкаму ўраду голада, беспрацоўя, тэрору і вайны». У працы ў вёсцы КПЗБ абапіралася на сялянскія камітэты [24, с. 44, 47], аднак пасіўнасць сялянства, пільны кантроль і своечасовыя дзеянні паліцыі абумовілі слабую эфектыўнасць і абмежаванасць адпаведных акцый [4, арк. 15].

Палітычная рознаскіраванасць і эканамічная абумоўленасць аграрных выступленняў вымушалі гісторыкаў казаць аб разрозненасці і слабой арганізацыі сялянскага руху [27, с. 169, 186]. У пачатку 1930 гг. КПЗБ не магла забяспечыць адчувальнага ўплыву на сялянства, бо самі знаходзіліся ў занядбаным стане ў сувязі з поспехамі паліцэйскіх органаў у барацьбе з «падрыўнымі элементамі» [8; 9]. Да таго ж разрозненыя выступленні маглі быць вынікам агітацыі з боку партый – палітычных канкурэнтаў КПЗБ, не кажучы пра актывізацыю беларускай культурна-асветніцкай справы. У 1933 г. справаздачы паліцыі адзначаюць актыўнасць арганізацый БІГіК, «Рунь», Беларускага дабрачыннага таварыства, якія ладзілі мерапрыемствы з удзелам дзясяткаў і соцень асобаў [9, арк. 16, 16адв., 46адв.–47адв.].

Думкі пра абвастрэнне ў перыяд эканамічнага крызісу класавай барацьбы ў вёсцы і вышэйзгаданыя падыходы і высновы па пытаннях сялянскага руху ў 1929–1933 гг. выказвалі І.В. Палуян і У.В. Палуян, аўтары калектыўнай манаграфіі па гісторыі КПЗБ і іншыя гісторыкі. У аснову аналізу сялянскага руху даследчыкі ставілі нават не выступленні сялян, а дэкларацыі КПЗБ, якая толькі планавала адпаведныя акцыі. Як было адзначана 19 верасня 1931 г. на пасяджэнні Прадстаўніцтва ЦК КПЗБ, «у сувязі з паглыбленнем эканамічнага крызісу мы маем паўсюдна нарастанне сялянскай барацьбы. …У большай частцы гэтая барацьба сялянскіх мас праходзіць стыхійна. Толькі на асобных участках мы мелі арганізаваную партыяй каардынаваную працу». Рашуча не змянілася сітуацыя і вясной 1933 г.: «Партарганізацыі слаба рэагуюць на падзеі, не надаюць дастатковай увагі арганізацыі барацьбы мас на падставе паўсядзённых патрэб», «не скранулася з месца арганізацыя барацьбы сельскагаспадарчых рабочых» [17, арк. 6, 385].

Даследчыкі ігнаравалі звесткі аб спробах камуністаў стварыць сялянскія камітэты разам з іншымі партыямі, якія мелі ўплыў у вёсцы. Для стварэння «баявога фронту

беспрацоўных вёскі» камуністы планавалі арганізаваць камітэты беспрацоўных, стварыць «сетку адзінафронтавых камітэтаў у вёсках, злучэнне іх у гмінныя і павятовыя камітэты». Але камуністаў не падтрымалі легальныя партыі, бо такія камітэты павінны былі арганізоўваць, у тым ліку, рабаўніцтва дзяржаўнай і прыватнай маёмасці ў выглядзе харчовых складоў, цягнікоў і інш. [4, арк. 14].

Аўтары сцвярджалі, што ў 1929–1930 гг. пад кіраўніцтвам антыкамасацыйных камітэтаў, створаных КПЗБ, партыя паспяхова кіравала барацьбой сялян супраць хутарызацыі і ліквідацыі сервітутаў [28, с. 218–219]. Адзначаючы слабую доказнасць аўтараў і адсутнасць канкрэтыкі ў дзейнасці партыі і адпаведных камітэтаў, заўважым, што польскія ўлады не фарсіравалі правядзенне названых пераўтварэнняў, іх дзеянні былі гнуткімі і асцярожнымі. «Ужо ў многіх месцах прайшлі ўсе тэрміны камасацыі, але фашысцкі ўрад адклаў правядзенне камасацыі, не жадаючы занадта абвастраць становішча. У іншых месцах фашысты ідуць на такі манеўр, каб разбіць адзіны фронт працоўных. Яны бяруць самых рэвалюцыйна настроеных сялян, якія з'яўляюцца правадырамі ў барацьбе супраць камасацыі, і выдзяляюць ім больш урадлівыя ўчасткі зямлі», – паведамляў функцыянер КПЗБ [17, арк. 15].

У духу партыйных пастаноў даследчыкі дэкларавалі пашырэнне ў 1929–1933 гг. працы КПЗБ у вёсцы. Сцвярджалася думка пра значнае ўзмацненне дзейнасці партыі па стварэнні прафсаюзнай апазіцыі ў прафсаюзах, якія знаходзіліся пад уплывам ППС і «Вызволення», па арганізацыі самастойных прафсаюзаў там, дзе іх не было, пра пачатак «шырокага ўцягнення» ў сельскія партарганізацыі пралетарыяў і паўпралетарыяў вёскі. Усе гэтыя мерапрыемствы, на думку гісторыкаў, садзейнічалі ўздыму рэвалюцыйных настрояў сярод сельскагаспадарчых рабочых [28, с. 216–219]. Аднак трэба адзначыць, што прыведзеныя выказванні не адлюстроўвалі рэаліі тагачаснага грамадска-палітычнага стану ў вёсцы. Нават у 1933 г. сяляне ў асноўным не дэманстравалі рэвалюцыйнай актыўнасці: дакументы часта гавораць пра «бернасць (пасіўнасць – *А.С.*) неарганізаванай палітычна і грамадска беларускай меншасці» [8, арк. 9адв.]. Прыведзеныя даследчыкамі ўспышкі лакальных сялянскіх выступленняў накшталт Асташынскага і Навасёлкаўскага, актыўнага ўдзелу ў забастоўцы сялян – лясных рабочых Белавежскай пушчы, разрэкламаваныя камуністычнай прапагандай як бліскучыя праявы рэвалюцыйнага сялянскага бунту, былі вынікам мэтанакіраванай дзейнасці камуністаў па інспірацыі рашучых настрояў сярод вясковага насельніцтва. КПЗБ выкарыстоўвала незадаволенасць сялянства пагаршэннем яго эканамічнага становішча, ажыццяўляла арганізацыйныя мерапрыемствы, накіраваныя на актывізацыю і радыкалізацыю сялянскіх выступленняў [2, арк. 26, 29; 3, арк. 22–24; 4, арк. 4, 14, 15, 16, 35]. Напрыклад, характэрнай рысай забастоўкі лясных рабочых і сялян-возчыкаў Белавежскай пушчы была наяўнасць легальнага прафсаюза «Саюз малазямельных сялян», які быў створаны па ініцыятыве ППС і аб'ядноўваў значную колькасць лясных рабочых і сялян-возчыкаў [32, с. 115]. Менавіта пэпээсаўскаму прафсаюзу належала кіруючая роля ў пачатку забастоўкі. Але актыўнасць у ёй камуністычных агітатараў, якая былі накіравана на абвастрэнне сітуацыі, у рэшце рэшт прывяла да роспуску сялянскага прафсаюза, «лясная адміністрацыя пачала адступаць ад запісаных у калектыўнай дамове ўмоў», якія адлюстроўвалі саступкі на карысць сялян, атрыманых у час змагання [32, с. 123].

Дэструктыўныя дзеянні камуністаў выяўляюцца і ў паўстанні ў Навасёлках Кобрынскага павета ў жніўні 1933 г., падзеі якога даследчыкі ўціснулі ў загадзя вызначаную схему пра нястачы і цяжкасці сялянскага жыцця ва ўмовах абвастрэння крызісу, абурэнне прыгнётам польскай улады [14, с. 34; 26, с. 201–203; 28, с. 283; 32, с. 124–125], запісваючы ў актыў камуністаў арганізацыйнае кіраўніцтва паўстаннем, называючы яго кульмінацыйным момантам сялянскага руху ў гады крызісу, відавочную правакацыйнасць функцыянераў КПЗБ падаючы як прыклад «самаахвярнай барацьбы». Гаварыць

пра чыста сялянскую самарганізацыю ў справе наладжвання паходу-дэманстрацыі, што прывёў да т.зв. паўстання ў Навасёлках, не прыходзіцца. У гэты час на Кобрыншчыне сваю актыўную дзейнасць праводзілі функцыянеры КПЗБ, якія на падпольных сходах сцвярджалі пра хуткае набліжэнне ў Польшчы рэвалюцыі. Але яшчэ ў студзені 1933 г. паліцыі праз сваіх агентаў і канфідэнтаў было вядома, што камуністы ў якасці асновы акцыі на вёсцы плануюць арганізоўваць масавыя мерапрыемствы ў выглядзе сходаў, масовак, паходаў да гмінных рад, павятовых сеймікаў, галадовак і антыкамасацыйных кампаній пад лозунгам «Ідзіце да абшарніцкіх свірнаў, забірайце хлеб і дзяліце паміж сялян» [2, арк. 22–24; 3, арк. 29].

Разнастайныя архіўныя дакументы адзначаюць павелічэнне колькасці інфарматараў і правакатараў у першай палове 1930-х гг., якія паралізавалі падпольную дзейнасць КПЗБ на вёсцы. Часта сустракаліся выпадкі, калі нізавыя кіраўнікі партыі і камсамола пасля арышту і допытаў у паліцыі адмаўляліся ад сваіх партыйных перакананняў, «падпісалі дэкларацыі на канфідэнтаў ці адкрыта сталі правакатарамі», «ёсць ячэйкі, якія пагалоўна перайшлі на службу паліцыі» [18, арк. 12; 30, с. 139]. Гэта сведчыла пра страту былымі апанентамі польскага рэжыму, прыхільнікамі камуністычных ідэалаў, ілюзій, звязаных з магчымасцю і жаданнем савецкага кіраўніцтва ажыццявіць «сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне» Заходняй Беларусі. Валюнтарызм камуністычных правадыроў, грэбаванне імі агульначалавечымі каштоўнасцямі ў Заходняй Беларусі, гвалтоўная калектывізацыя, арышт і фізічнае знішчэнне правадыроў беларускага нацыянальна-вызваленчага руху ў БССР канчаткова пераконвалі сялян у памылковасці сваіх папярэдніх сацыяльна-палітычных уяўленняў пра «сацыялістычны рай».

Відавочны спад сялянскага руху ў Заходняй Беларусі ў канцы 1933–1935 гг. выявіўся ў памяншэнні колькасці і працягласці выступленняў сялян, у скарачэнні колькасці іх удзельнікаў, у паслабленні рэвалюцыйнай вастрыні гэтых выступленняў, у зніжэнні палітычнай актыўнасці сялянскіх мас. Ідэя яднання на глебе адзінага фронту з удзелам камуністаў не выклікала асаблівага аптымізму ў шэрагах былых палітычных апанентаў [30, с. 141]. Што да праяў апазіцыйнага руху, то іх трэба тлумачыць абвастрэннем супярэчнасцей у заходнебеларускай вёсцы, звязаных з працэсамі сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў, якія суправаджаліся свавольствам мясцовых чыноўнікаў і прадпрымальнікаў, як, напрыклад, падзеі Нарачанскага паўстання. Камуністы, выкарыстоўваючы звычайную тактыку дапасавання да вострых падзей, на іх фоне дэманстравалі сваю прысутнасць. Выступленне нарачанскіх рыбакоў дало падставы даследчыкам пацвердзіць схему, яны акцэнтавалі ўвагу на ажыўленні сялянскага руху на фоне ўзмацнення барацьбы рабочага класа на чале з КПЗБ, гаварылі пра адзінадушнасць сялян-рыбакоў, нягледзячы на прысутнасць сярод іх штрэйкбрэхераў [32, с. 147–154; 28, с. 343–345].

Вучоныя рабілі штучныя абагульненні, прыцягваючы адзінкавыя, лакальныя падзеі на агульнакраявы ўзровень. Па меркаванні гісторыкаў, КПЗБ накіроўвала выступленні сялян у рэчышча арганізаванай барацьбы, якая нярэдка прыводзіла да масавых выступленняў сялян цэлых вёсак. З гэтым нельга пагадзіцца, бо своеасаблівая стагнацыя ў жыцці партыі пасля першых рэпрэсій у дачыненні да кіраўніцтва ў 1936 г. такія поспехі рабіла немагчымымі. Адзінкавыя праявы сялянскага свавольства наўрад ці можна ўстаўляць у рамкі «арганізаванай барацьбы» пад кіраўніцтвам КПЗБ, у тым ліку «палітычных выступленняў у форме палітычных сходаў, масовак і дэманстрацый» [27, с. 193–194, 206–210, 217]. Так, «рэвалюцыйны ўздым 1936–1938 гг.», пра які ахвотна гаварылі вучоныя, асноўным зместам меў эканамічную барацьбу, у цэнтры якой была арганізаваная «Стронніцтвам людовым» сялянская забастоўка 1937 г. Пры гэтым гісторыкі называлі дэструктыўнымі дзеянні палітычных канкурэнтаў КПЗБ, у першую чаргу «Строннiцтва людовае» [13, с. 119; 28, с. 369–373].

**Заключэнне**

Такім чынам, у другой палове 1950-х – 1980-я гг. гісторыя сялянскага руху ў Заходняй Беларусі 1921–1939 гг. атрымала значную ўвагу даследчыкаў. Гісторыкі, адзначаючы перыяды актывізацыі і спаду сялянскага руху, адмовіліся ад тэзіса 1920–1930-х гг. пра яго няспыннае ўзрастанне. Адзінадушша аўтараў назіралася ў наданні КПЗБ кіруючай ролі ў сялянскім руху, які залежаў ад палітыкі кампартыі і яе актыўнасці ў розныя перыяды. Гісторыкі вымушаны былі шукаць пацвярджэнне рэвалюцыйнасці сялянскага руху, абумоўліваючы яго актыўнасць уплывам рабочага класа. Найважнейшай умовай паспяховага разгортвання рэвалюцыйнай барацьбы, на думку даследчыкаў, было існаванне саюза рабочых і сялян, за стварэнне і ўмацаванне якога КПЗБ пастаянна вяла барацьбу. Паказальным вынікам гэтай працы было стварэнне пад кіраўніцтвам КПЗБ масавых рэвалюцыйна-дэмакратычных арганізацый БСРГ і «Змагання», якія і былі асноўнай арганізацыйнай формай саюзу рабочага класа і сялянства. Абсалютызуючы ролю КПЗБ, вучоныя ігнаравалі асаблівасці гістарычнага развіцця самой партыі і яе цяжкасці па забеспячэнні трывалага ўплыву на сялян, і ўдзел іншых партый у арганізацыі сялянскага руху.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Вабішчэвіч, А. М. Нацыянальна-культурнае жыццё Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) : манаграфія / А. М. Вабішчэвіч. – Брэст : БрДУ, 2008. – 319 с.

2. Квартальные и месячные отчеты Брестской поветовой коменды госполиции об общественно-политическом движении на территории данного повета // Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (ДАБВ). – Ф. 92. Воп. 1. Спр. 65.

3. Информация поветовой коменды и переписка с постерунками о деятельности подпольной коммунистической организации в Столинском повете // ДАБВ. – Ф. 2028. Воп. 1. Спр. 38.

4. Информация поветовой коменды о деятельности подпольной коммунистической организации, о наблюдении за отдельными гражданами и др. // ДАБВ. – Ф. 2028. Воп. 1. Спр. 246.

5. Сообщение Слонимского поветового старостава о вступлении бывших членов Белорусской Рабоче-Крестьянской Громады в Белорусский крестьянский союз // Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці (ДАГВ). – Ф. 551. Воп. 1. Спр. 1028.

6. Месячные отчеты о заводовом и общественно-политическом движении на территории Лидского повета за 1926 г. // ДАГВ. – Ф. 200. Воп. 2. Спр. 8.

7. Месячные отчеты об общественно-политическом движении и обеспечении государственной безопасности на территории Лидского повета (1933 г.) // ДАГВ. – Ф. 200. Воп. 2. Спр. 9.

8. Оперативные сводки Новогрудского воеводского управления Министерства внутренних дел об общественно-политическом движении на территории воеводства за 1-е полугодие 1933 г. // ДАГВ. – Ф. 200. Воп. 2. Спр. 12.

9. Оперативные сводки Новогрудского воеводского управления Министерства внутренних дел об общественно-политическом движении за 2-е полугодие 1933 г. // ДАГВ. – Ф. 200. Воп. 2. Спр. 13.

10. Кобяк, С. В. Под знаменем пролетарской солидарности. Компартия Западной Белоруссии в борьбе за сплочение трудящихся (1923–1929 гг.) / С. В. Кобяк. – Минск : Беларусь, 1979. – 142 с.

11. Крывуць, В. І. Барацьба за маладое пакаленне Заходняй Беларусі і праўрадавы маладзёжны рух (1926–1939 гг.) : манаграфія / В. І. Крывуць. – Баранавічы : РВА БарДУ, 2013. – 272 с.

12. Кухарев, Б. Е. Сельское хозяйство Западной Белоруссии (1919–1939 гг.) / Б. Е. Кухарев ; под науч. ред. проф. И. Н. Шемякина. – Минск : Выш. шк., 1975. – 112 с.

13. Ладысев, В. Ф. В борьбе за демократические права и свободы: Из исторического опыта Компартии Западной Белоруссии. 1926–1938 гг. / В. Ф. Ладысев. – Минск : Беларусь, 1988. – 189 с.

14. Мацко, А. Н. Борьба трудящихся Польши и Западной Белоруссии против фашизма (1933–1939 гг.) / А. Н. Мацко. – Минск : Изд-во АН БССР, 1963. – 206 с.

15. Мацко, А. Н. Революционная борьба трудящихся Польши и Западной Белоруссии против гнета буржуазии и помещиков (1918–1939 гг.) / А. Н. Мацко. – Минск : Беларусь, 1972. – 335 с.

16. Отчеты и корреспонденция Брестского окружного комитета КПЗБ и КСМЗБ // Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 242п. Воп. 1. Спр. 26.

17. Отчеты, резолюции, информации и письма ЦК КПЗБ и переписка краевого бюро ЦК КПЗБ с Представительством и округами о положении в КПЗБ // НАРБ. – Ф. 242п. Воп. 1. Спр. 47.

18. . Отчеты, информации и материалы опроса работников Новогрудского округа о состоянии работы партийных и комсомольских организаций // НАРБ. – Ф. 242п. Воп. 1. Спр. 57.

19. Материалы организационного состояния и массовой работы «Громады» и списки кружков «Громады» (1926–1927) // НАРБ. – Ф. 242п. Воп. 1. Спр. 103.

20. Отчеты, информации, письма и материалы опроса работников Белостокского округа о состоянии работы партийных организаций, о забастовке лесных рабочих и др. // НАРБ. – Ф. 242п. Воп. 1. Спр. 426.

21. Месячные отчеты ЦК Компартии Западной Белоруссии (1925 г.) // НАРБ. – Ф. 242п. Воп. 2. Спр. 61.

22. Информация (ЦК Компартии Западной Белоруссии) об аграрном вопросе в Западной Белоруссии и др. // НАРБ. – Ф. 242п. Воп. 2. Спр. 66.

23. Докладная записка ЦК Компартии Польши и Западной Белоруссии в ИККИ «О повстанческих настроениях в Западной Белоруссии и задачах КПЗБ». 1-й комплект (1927) // НАРБ. – Ф. 242п. Воп. 2. Спр. 128.

24. Палуян, І. В. Сялянскі рух у Заходняй Беларусі ў 1932–1933 гадах / І. В. Палуян // Весці АН БССР. Сер. грамад. навук. – 1960. – № 1. – С. 42–54.

25. Палуян, У. А. Беларуская сялянска-рабочая Грамада / У. А. Палуян. – Мінск : Навука і тэхніка, 1967. – 224 с.

26. Полуян, В. А. Революционно-демократическое движение в Западной Белоруссии (1927–1939 гг.) / В. А. Полуян. – Минск : Наука и техника, 1978. – 359 с.

27. Полуян, В. А. Революционное и национально-освободительное движение в Западной Белоруссии в 1920–1939 гг. / В. А. Полуян, И. В. Полуян. – Минск : Госиздат, 1962. – 222 с.

28. Революционный путь Компартии Западной Белоруссии (1921–1939 гг.) / А. Н. Мацко [и др.] ; под ред. А. Н. Мацко и В. Е. Самутина. – Минск : Беларусь, 1966. – 403 с.

29. Рижский мир в судьбе белорусского народа. 1921–1953 гг. : в 2 кн. / Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т истории ; редкол.: А. А. Коваленя [и др.]. – Минск : Белорус. наука, 2014. – Кн. 1. – 593 с.

30. Савіч, А. А. Нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.): гістарыяграфія праблемы : манаграфія / А. А. Савіч ; навук. рэд. А. А. Каваленя ; Брэсц. дзярж. ун-т імя А. С. Пушкіна. – Брэст : БрДУ імя А. С. Пушкіна, 2012. – 288 с.

31. Сорокин, А. А. Аграрный вопрос в Западной Белоруссии (1920–1939 гг.) / А. А. Сорокин. – Минск : Наука и техника, 1968. – 201 с.

32. Сорокин, А. А. Революционное и освободительное крестьянское движение в Западной Белоруссии (1920–1939 гг.) / А. А. Сорокин. – Минск : БГУ, 1970. – 171 с.

33. Царюк, А. В. Борьба трудящихся Западной Белоруссии за свое освобождение (1921–1927 гг.) / А. В. Царюк // Сб. науч. работ БГУ имени В. И. Ленина. – Минск : БГУ, 1958. – Вып. 1 (40). – С. 113–138.

34. Царюк, И. О. КПЗБ в борьбе за интернациональное воспитание трудящихся (1929–1933 гг.) / И. О. Царюк // Сб. науч. работ БГУ имени В. И. Ленина. – Минск, 1958. – Вып. 1 (40). – С. 39–59.

Рукапіс паступіў у рэдакцыю 30.12.2015

***Savich A.A.*** **The Peasant Movement in Western Belarus in 1921–1939 in Belarusian Historiography in mid 1950s – 1980s**

*The research reflects the main scientific and methodological approaches to the study and reflection of history of the peasant movement in Western Belarus in 1921–1939 by Belarusian historians of the 1950s–1980s. Demonstrating the expanding and deepening of the study of the problems from the previous period, the researchers were unable to go beyond the agreed Marxist-Leninist ideology of the dominant approaches and schemes. The determining theses of this concept was an exaggeration activity, politicized and revolutionary of peasant movement, dependent on the state of the workers' actions caused by the state of the development of peasant struggles and organizational capacity of the Communist Party of Western Belarus, ignoring the role of the political rivals of the Communist Party in organizing and conducting of the peasant-agrarian activities. Based on a variety of sources, primarily archival materials, concluded unfounded and biased given theses carried out adjustment and clarification of the respective positions.*